# Факультэту эканомікі і права МДУ імя А. Куляшова спаўняецца 25 год

**За чвэрць стагоддзя тут падрыхтаваны тысячы спецыялістаў сферы правазнаўства і эканомікі. Супрацоўнікі факультэта - прафесіяналы з высокай навуковай кваліфікацыяй, а студэнты - таленавітая і здольная моладзь. З чаго пачыналася гісторыя факультэта, хто стаяў ля вытокаў і чым факультэт жыве сёння - у нашым матэрыяле.**



# Да поспеху праз веды!

За адносна кароткі тэрмін факультэт эканомікі і права прайшоў шлях ад адкрыцця новых спецыяльнасцяў на базе гістфака да ўзнікнення асобнай самастойнай адзінкі ў структуры Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова.

Правобраз факультэта з'явіўся ў сістэме ўніверсітэта ў 1998 годзе. Тады гістарычны факультэт першы раз набраў студэнтаў для навучання на новым накірунку - «Дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне». Хутка кіраўніцтва ўніверсітэта зразумела: новыя часы патрабуюць новых рашэнняў. І 1 снежня загадам рэктара быў заснаваны эканамічны факультэт. Праз год у абітурыентаў з'явілася магчымасць паступаць на спецыяльнасці «Правазнаўства» і «Сацыялогія». А ўжо летам 2001-га рашэннем Савета Універсітэта структурная адзінка атрымала новую назву - «Факультэт эканомікі і права».

Свой унёсак у фарміраванне традыцый факультэта зрабілі лепшыя навукоўцы. А дэканамі факультэта ў розныя часы былі А. І. Канашэвіч, А. М. Сазонава, Д. А. Рагаўцоў.

Сёння на факультэце існуе якасная сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў. Вышэйшую адукацыю атрымлівае амаль тысяча студэнтаў з Беларусі і замежжа. Яны навучаюцца на сямі спецыяльнасцях першай ступені: «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве», «Бізнэс-адміністрыраванне», «Мэнэджмент», «Эканамічная інфарматыка» і «Кіраванне навучальнымі рэсурсамі», «Правазнаўства» і «Эканамічнае права», «Сацыялогія» і «Сацыяльныя камунікацыі». Таксама на факультэце існуе магчымасць атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені па магістарскай праграме «Юрыспрудэнцыя».

Сапраўдныя поспехі навучальнай установы - гэта студэнты, якія пасля заканчэння ўніверсітэта сталі прафесіяналамі высокага класа. Факультэт эканомікі і права шчыра ганарыцца сваімі выпускнікамі, сярод якіх навукоўцы, выкладчыкі ВНУ, дзяржаўныя служачыя суддзейскага корпуса, супрацоўнікі органаў пракуратуры, Следчага камітэту Рэспублікі Беларусь, а таксама натарыусы і адвакаты, бізнэсоўцы і прадпрымальнікі.

Як адзначыў дэкан факультэта эканомікі і права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт **Андрэй Сляпцоў**, за 25 год на факультэце сфарміраваліся моцныя традыцыі.

- За чвэрць стагоддзя прафесарска-выкладчыцкаму саставу факультэта ўдалося стварыць усе ўмовы для фарміравання эканамічнай, юрыдычнай і сацыялагічнай навуковых школ, якія сёння развіваюцца ў шчыльным узаемадзеянні і супрацоўніцтве паміж сабой і з вытворчасцю. У гэтым навучальным годзе мы ажыццяўляем пілотны праект па наборы абітурыентаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў для ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці. У сувязі з гэтым павялічылі агульную колькасць бюджэтных месцаў. У наступным годзе таксама плануем павялічыць набор на бюджэт па спецыяльнасці «Правазнаўства». Мы ганарымся нашымі студэнтамі і выпускнікамі. Сёлета студэнты нашага факультэта Ніна Пятроўская і Дзмітрый Варабей сталі пераможцамі ўніверсітэцкага этапа конкурса «Студэнт года - 2023». Студэнт 3 курса Яўген Свінагон увайшоў у склад Маладзёжнага савета пры Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь. А Камарова Дзіяна выбрана кандыдаткай ад МДУ імя А. Куляшова ў Маладзёжны парламент пры Магілёўскім гарадскім Савеце дэпутатаў, - адзначыў дэкан.

Дваццаць пяць год факультэт эканомікі і права МДУ імя А. Куляшова ўзбагачае беларускую навуку новымі даследаваннямі і распрацоўкамі. Чвэрць стагоддзя факультэт рыхтуе высокапрафесійных спецыялістаў для розных сфер функцыянавання грамадства. Мабыць, хтосьці скажа: 25 год - кароткі тэрмін. Але ўзрост не адыгрывае галоўную ролю ў гэтым пытанні. Самае важнае, каб чарговы юбілей стаў яшчэ адной прыступкай да новых здзяйсненняў пад дэвізам «Да поспеху праз веды!».

На факультэце запланаваная шырокая праграма святкавання: фотавыстава і выстава навуковай, вучэбнай і метадычнай літаратуры, інфармацыйныя гадзіны, урачыстае мерапрыемства. 8 снежня адбудзецца VII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Дзяржава і права: актуальныя праблемы фарміравання прававой свядомасці», прысвечаная 25-годдзю факультэта эканомікі і права МДУ імя А. Куляшова.

*Алёна КУХАРАВА,*
*фота ФЭіП МДУ імя А. Куляшова*